5. *Nora P.,* Realms of Memory: Rethinking the French past / ed. P. Nora. – Columbia University Press. – 1996. – 642 p.
6. *Silverman H.,* Contested Cultural Heritage: Religion, Nationalism, Erasure and Exclusion in a Global World / H/ Silverman. – NY. – 2011. – 295 p.
7. *Tunbridge J. E., Ashworth G.J.,* Dissonant Heritage: The Management of the Past as a Resource in Conflict / J.E. Tunbridge, C.J. Ashworth. – Belhaven Press. – 1996. – 314 p.
8. *Лоуэнталь Д.*, Прошлое – чужая страна / Д. Лоуэнталь. – Даль. – 2004. – 624 с.
9. Методологические вопросы изучения политики памяти: сб. научн. тр. / отв. ред. А. И. Миллер, Д. В. Ефременко. – М.-СПб: Нестор История, 2018. – 224 с.

**Васільеў В. М.**

## НАВУКОВЫЯ РЭКАНСТРУКЦЫІ ЎЗБРАЕННЯ: АКТУАЛЬНАСЦЬ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫКАРЫСТАННЯ

***Ключавыя словы:*** навуковая рэканструкцыя, узбраенне, ваенны рыштунак.

Гісторыя войн і вайсковае мастацтва – тэмы, якія цікавілі гісторыкаў ужо ў старажытнасці. Не страцілі яны актуальнасці і зараз. Усплёск зброязнаўства адбыўся на пачатку другой паловы XX ст. і звязаны з уводам і шырокім выкарыстаннем археалагічных матэрыялаў. У гэты час былі выдадзены працы, прысвечаныя вывучэнню зброі і ваеннага рыштунку ў заходняй Еўропе [18] старажытнарускага ўзбраення [5–7] і рыштунку вершніка і баявога каня [8], узбраенню Ноўгарада Вялікага [11], старажытнарускай кідальнай зброі [12], скіфскаму даспеху [17], пазней, у 1980 праца прысвечаная ўзбраенню енісейскіх кыргызаў VI–XII стст. [16]. Гэтыя класічныя працы выклікалі шырокую цікавасць да гісторыі вайсковай справы перыядаў старажытнасці і сярэднявечча.

Вайна ў цэлым як вялікі пласт гісторыі кожнага чалавечага грамадства выклікае цікавасць не толькі ў прафесійных гісторыкаў і навукоўцаў. Ваенная справа і падзеі ваеннай гісторыі адлюстраваны ў музейных экспазіцыях праз дэманстрацыю рэальных прадметаў узбраення, частак даспехаў і інш. Паступова ад прынятага ў музейнай справе класічнага “прадметацэнтрычнага” падыхода адбыўся пераход у бок дапаўнення рэальнага артэфакта суправаджаючымі матэрыяламі графічнага і іншага характару. Гэта звязана з тым, што стан захаванасці асобных прадметаў узбраення і частак даспехаў не дазваляе непадрыхтаванаму чытачу ці наведвальніку музея скласці поўнае уяўленне аб іх знешнім выглядзе. Яшчэ цяжэй уявіць, як выглядалі асобныя ваяры і іх атрады. Таму для зброязнаўства значную ролю адыгрывае навуковая рэканструкцыя зброі, даспехаў і рыштунку ваяроў.

Навуковую рэкантрукцыю зброі і даспехаў можна падзяліць на графічную і прадметную (эксперыментальную).

*Графічная рэканструкцыя* ўяўляе сабой разнастайныя варыянты прамалёвак, пачынаючы ад асобных элементаў зброі і даспехаў да батальных сцэнаў. Да графічнай можна таксама аднесці і 3D рэканструкцыі [19]. Графічная рэканструкцыя – важны сродак у папулярызацыі гістарычнай спадчыны. У заходняй Еўропе можна прывесці прыклад прац мастака Ангуса МакБрайда, якія ён рабіў для выдавецтва Osprey publishing у серыі Men-at-Arms. Для савецкай і сучаснай расійскай гістарыяграфіі можна ўзгадаць працы М.В. Гарэліка і Ю.С Худзякова [4,16]. М.В. Гарэліка можна назваць пачынальнікам навуковай мастацкай графічнай рэканструкцыі даспехаў і ўзбраення розных эпох. Таксама ён займаўся рэканстуяваннем "батальных" сцэн перыяду мангольскага заваяваннія Залатой Арды, постмангольскіх дзяржаваў. Працы былі шырока прадстаўлены ў навуковых і навукова папулярных выданнях і дзіцячых энцыклапедыях. Гэта спрыяла папулярызацыі і павышэнню цікавасці дзяцей і моладзі да культурна-гістарычнай спадчыны.

Значны ўнёсак у папулярызацыю зброязнаўства і гісторыю ваеннай справы намадаў цэнтральнай Азіі і паўднёвай Сібіры належыць Навасібірскай школе, якая была заснавана Ю.С. Худзяковым. Вялікая роля там адводзіцца як графічным, так і прадметным рэканструкцыям даспехаў і ўзбраення [2].

Эпоха вікінгаў і эпоха пачатку фарміравання Старажытнай Русі таксама знайшла адлюстраванне ў шэрагу прац выдатнага даследчыка і мастака А.В. Фёдарава. Яго навуковыя рэканструкцыі прысутнічаюць у пастаянных экспазіцыях шэрагу музеяў на тэрыторыі Расіі, прыводзяцца ў навукова-папулярных выданнях. Увага даследчыка была скіравана на рэканструкцыю зброі і рыштунку вершніка і каня (воіны Хазарскага каганата, дружыннікі па матэрыялах Гнёздаўскага і Кіеўскага некропаля) [14, с. 9 – 11, 16, 39, 56, 99, 109, 115; 15, 15 с. 2–5]. Асаблівасцю графічных рэканструкцый А.В. Фёдарава з'яўляецца дасканалае выяўленне зброі і рыштунку, пры якім мастацкія якасці малюнка застаюцца на высокім узроўні.

У айчыннай гістарыяграфіі першыя графічныя рэканструкцыі вывяроў з'явіліся ў працы Ю.А. Заяца (па матэрыялах Заслаўскага некропаля) [3, с. 201]. Адной з першых спроб навуковай графічнай рэканструкцыі быў камплект паштовак "Беларускі вайсковы строй і зброя", дзе навуковым кансультантам быў Г.М. Сагановіч [1]. Навуковыя графічныя рэканструкцыі былі Зроблены Ю. Лупіненкам у артыкулах, прысвечаных узбраенню ранніх славян, а таксама зброі і даспехам з Гомельскай збраёвай майстэрні [9, с. 115 – 122; 10, с. 140 – 154]. Рэканструкцыі ўзбраення і рыштунку ваяроў Полацкага княства часоў Усяс-

лава Чарадзея прыведзены ў навукова-папулярнай працы М.А. Плавінскага [13]. Трэба адзначыць, што большасць рэканстукцый у Беларусі выконвалася не непасрэдна даследчыкамі, а ў супрацоўніцтве з мастакамі.

*Прадметная і эксперыментальная рэканструкцыя* – перспектыўны напрамак сучасных археалагічных даследванняў. Сутнасць яе ў тым, што на аснове дэталёвага аналіза прадметаў матэрыяльнай культуры і археалагічных помнікаў навукоўцы вырабляюць дакладныя копіі артэфактаў, выкарыстоўваючы аўтэнтычныя матэрыялы (жалеза, бронза, скура і г.д.). Такія рэканструкцыі становяцца прадметам спецыяльных навуковых эксперыментаў, падчас якіх даследчыкі аднаўляюць старажытныя і сярэднявечныя вытворчыя тэхналогіі, удакладняюць асаблівасці выкарыстання тых ці іншых прадметаў матэрыяльнай культуры [2, с. 99].

Цікавасць да ваеннай гісторыі дала пачатак шырокаму грамадскаму руху, які зараз вядомы як ваенна-гістарычная рэканструкцыя. Часам нараджэння гэтага руху ў СССР можна лічыць 70-я гг. XX ст. і першапачаткова ён быў звязаны з папулярызацыяй і вывучэннем гісторыі напалеонаўскіх войнаў. З пачатку 90-х гадоў пачынаецца шырокая зацікаўленасць у рэканструкцыі сярэдніх вякоў, прыкладна ў гэты ж час з’яўляюцца суполкі, асноўным напрамкам дзейнасці якіх была эпоха з’яўлення старажытнарускай дзяржавы і Эпохі вікінгаў.

У Беларусі гістарычная рэканструкцыя была цесна звязана з нацыянальным адраджэннем і цікавасцю да гісторыі ВКЛ. З пачатку 2000-х гадоў у Беларусі пачынаецца рэканструкцыя Эпохі вікінгаў, Полацкага княства і іншых старажытнарускіх земляў. Рэканструктарскі рух, у асноўнай сваёй массе, складаецца з энтузіястаў. Сярод суполак энтузіястаў можна назваць “Нагльфар”, “Варгенторн” (Віцебск). Аднак, негледзячы на гэта, на сённяшні момант некаторыя энтузіясты і майстры дасягнулі сапраўды высокага ўзроўню навуковай рэканструкцыі прадметаў узбраення і даспехаў (прыклад – Зміцер Храмцоў, Зміцер Андрэеў). Акрамя выкарыстання аўтэнтычных матэрыялаў праводзяцца спробы аднаўлення старажытных тэхналогій у вытворчасці зброі і ваеннага рыштунку.

*Актуальнасць і перспектывы.* Графічная навуковая рэканструкцыя, як узгадвалася вышэй, вельмі запатрабавана ў музейнай практыцы: яна выкарыстоўваецца як дапаможны матэрыял ў экспазіцыйнай дзейнасці. Часам толькі дзякуючы графічным навуковым рэканструкцыям у нас ёсць магчымасць праілюстраваць перыяды гісторыі і рэгіёны, якія амаль не адлюстраваны ў пісмовых і выяўленчых крыніцах, а нашыя веды грунтуюцца толькі на археалогіі.

Графічныя рэканструкцыі займаюць значнае месца ў музейнай педагогіцы. Іх візуальны кампанент больш якасна дазваляе раскрываць пэўныя тэмы музейных заняткаў. Прыгожа выкананая рэканструкцыя абуджае ў дзяцей цікавасць да ваеннай справы і гісторыі ў цэлым. Таму ў сучасных энцыклапедычных выданнях для дзяцей пашыраецца выкарыстанне графічных рэканструкцый рознага кшталту.

Зараз паступова музей адмаўляецца ад аднаго з выключных правілаў – "глядзець можна, чапаць не". Як прыклад, праз выраб натурных копій музейных прадметаў, якія можна трымаць у руках наведвальнікам. Часам у экспазіцыйнай практыцы побач з археалагічным, каразіраваным ці пацінаваным зламаным прадметам у вітрыны змяшчаецца сучасная яго рэпліка, што дазваляе наведвальнікам зразумець як выглядаў прадмет на момант яго вырабу і выкарыстання. Рэканструкцыі рыштунку вершніка і каня дазваляюць найбольш поўна ўспрымаць гістарычныя перыяды і падзеі.

Таксама прадметныя рэканструкцыі дазваляюць рэалізоўваць праекты для людзей са слабым зрокам. Гэта адзін са спосабаў іх уключэння ў працэс пазнання ваеннай гіторыі розных краін і перыядаў.

Патэнцыял выкарыстання графічнай і прадметнай рэканструкцыі не абмежаваны толькі навукова-папулярнымі выданнямі і музейнымі практыкамі. Яны выкарыстоўваюцца ў педагогіцы па-за традыцыйнымі музеямі. Напрыклад археапарках і музеях пад адкрытым небам.


1. Беларускі вайсковы строй і зброя XII–XVIII стст. Камплект паштовак на беларускай мове [Выяўленчы матэрыял] / укладальнік і аўтар тэкстаў: Грыгор'еў М. – Мінск, 1996. – 12 паштовак.
2. Бобров, Л. А. Доспехи волка / Л. А. Бобров, Ю. С. Худяков, Ю. А. Филиппович // Наука из первых рук. – 2015. – № 1. – С. 92–105.
3. Заяц, Ю. А. Заславль в эпоху феодализма / Ю. А. Заяц. – Минск : Наука и техника, 1995. – 207 с.
4. Измайлов, И. Л. Вклад М. В. Горелика в развитие отечественной военной археологии / И. Л. Измайлов // Археология Евразийских степей. – 2017. – №5. – С. 240–243.
5. Кирпичников, А. Н. Древнерусское оружие: Вып. 1. Мечи и сабли IX–XIII вв. / А. Н. Кирпичников. – М.; Л. : Наука. – 176 с.
6. Кирпичников, А. Н. Древнерусское оружие: Вып. 2. Копья, сулицы, боевые топоры, булавы, кистени IX–XIII вв. / А. Н. Кирпичников. – М.; Л. : Наука. – 147 с.
7. Кирпичников, А. Н. Древнерусское оружие: Вып. 3. Доспех, комплекс боевых средств IX–XIII вв. / А. Н. Кирпичников. – Л. : Наука. – 92 с.
8. Кирпичников, А. Н. Снаряжение всадника и верхового коня на Руси IX–XIII вв. / А. Н. Кирпичников. – Л. : Наука. – 112 с.
9. Лупиненко, Ю. М. Пластинчатый доспех восточных славян в VII–X вв. / Ю. М. Лупиненко // Русь на перехресті світів (міжнародни впливи на фармування давньоруської держави) IX–XI ст.: матеріали міжнородного польового архео-

логічного семінару, Чернігів – Шестовиця, 20–23 липня 2006 р. / Інститут археології НАН України, Чернігівський державний педагогічний університет імені Т. Г. Шевченка, Інститут археології та стародавньої історії Північного Лівобережжя ; ред.: П. П. Толочко, А. А. Горский, М. Дімнік, В. О. Дятлов, В. П. Коваленко, О. Б. Коваленко, О.П. Моцяю – Чернігів : Сіверянська думка, 2006. – С. 115–122.
10. Лупиненко, Ю. М. Чешуйчатый доспех восточнославянского ратника XII–XIII вв. (по материалам раскопок в Гомеле) / Ю. М. Лупиненко, О. А. Макушников // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2008. – Вып. 15. – С. 140–154.
11. Медведев, А. Ф. Оружие Новгорода Великого / А. Ф. Медведев // Труды Новгородской археологической экспедиции. Т. II // Материалы и исследования по археологии СССР (МИА). – М., 1959. – № 65. – 121–191.
12. Медведев, А. Ф. Ручное метательное оружие (Лук и стрелы, самострел) VIII–XIV вв. / А. Ф. Медведев. – М. : Наука, 1966. – 184 с.
13. Плавінскі, М. А. Войска Полацкага княства ад часоў Рагвалода да эпохі Усяслава Чарадзея / М. А. Плавінскі. – Мн. : Галіяфы, 2012. – 48 с.
14. Родина. – 2002. – № 11–12.
15. Фёдоров, О. В. Комплекс вооружения воинов Хазарского каганата / О. В. Фёдоров, Н. А. Плетнёва // Цейхгауз. – 2006. – № 22. – С. 2–5.
16. Худяков, Ю. С. Вооружение енисейских кыргызов VI–XII вв. / Ю. С. Худяков. – Новосибирск : Наука, 1980. – 176 с.
17. Черненко, Е. В. Скифский доспех / Е. В. Черненко. – Киев : Наукова думка, 1968. – 192 с.
18. Oakeshott, E. The Archaeology of Weapons: Arms and Armour from Prehistory to the Age of Chivalry / E. Oakeshott. – Boydell Press, 1999. – 358 p.
19. Wijnhoven, M. A. The equipment of a Germanic warrior from the 2nd–4th century AD: Digital reconstructions as a research tool for the behaviour of archaeological costumes / M. A. Wijnhoven, A. Moskvin, M. Moskvina // Journal of Cultural Heritage. – 2021. – Vol. 49. – P. 48–58.

**Вовк О. И.**

## МЕМОРИАЛЬНЫЕ ДОСКИ В СОЦИОКУЛЬТУРНОМ ПРОСТРАНСТВЕ ХАРЬКОВА: ЭВОЛЮЦИЯ ЗНАКОВ КОММЕМОРАЦИИ В СТОЛЕТНЕЙ ПАНОРАМЕ

***Ключевые слова:*** мемориальная доска, Харьков, коммеморация, политика памяти, «место памяти».

Мемориальные доски являются одними из наиболее многочисленных знаков коммеморации в современных городах Восточной Европы: например, в Харькове их насчитывается более пятисот. Эти объекты средствами вербальной и визуальной выразительности способствуют формированию представлений о городе у его гостей и жителей, несмотря на целый ряд неизменно присущих им ограничений. В частности, малый линейный размер в ряде случаев влечет за собой